

Штогод у першую нядзелю верасня ў краіне адзначаецца Дзень беларускага пісьменства. Сталіцай свята 5 верасня 2021 года стане горад Капыль Мінскай вобласці. Дарэчы, тут жа ладзіцца і Мінскі абласны фестываль-кірмаш працаўнікоў сяла “Дажынкі”.

Канцэпцыя свята прадугледжвае адлюстраванне шляху пісьменства і друку ў Беларусі, паказ адзінства беларускага друкаванага слова з гісторыяй і культурай беларускага народа.

У праграме святкавання – прэзентацыя навінак кніжных выдавецтваў, сустрэчы з беларускімі і замежнымі літаратарамі, журналістамі, выступленні паэтаў і пісьменнікаў, творчых калектываў і выканаўцаў.




WWW.BELTA.BY